## Электронны бюлетэнь: ЛГБТК+ у Беларусі

*07-09.2024*

**ЗМЕСТ:**


1. Становішча беларускай ЛГБТК+ супольнасці
2. Асвятленне ЛГБТК+ тэматыкі ў беларускіх масмедыя
3. Навіны Праваабарончай ініцыятывы “Журналісты за талерантнасць” (J4t) / Gpress.info


### 1. СТАНОВІШЧА БЕЛАРУСКАЙ ЛГБТК+ СУПОЛЬНАСЦІ

Брутальная атака на ЛГБТК+ супольнасць узмацнілася ў Беларусі з канца жніўня 2024 года падчас разгляду законапраекта аб забароне “ЛГБТ-прапаганды”.

Прынамсі восем трансгендарных асобаў былі арыштаваныя, і не менш за 15-20 іншых квір-асобаў прайшлі праз затрыманні. У шэрагу выпадкаў у прыватных кватэрах затрыманых прадстаўнікоў ЛГБТ-супольнасці праводзіліся ператрусы. Паведамлялася, што ахвяры падвяргаліся збіццю, псіхалагічнаму ціску і абразам.

Некаторых з іх улады абвінавацілі ў хуліганстве. Пэўнай частцы затрыманых былі высунутыя надуманыя абвінавачанні ў здзяйсненні крымінальнага злачынства, звязанага з “парнаграфіяй”. (Неабходна нагадаць пра тое, што паводле надоечы зацверджанай пастановы Мінкульта Беларусі “парнаграфіяй” лічыцца “наўмыснае дэманстраванне нетрадыцыйных палавых стасункаў і (або) палавых паводзінаў”.)

Зацкаванасць, поўная адсутнасць магчымасці сацыялізацыі, рэальная рызыка крымінальнага пераследу проста за публічнае сцверджанне сваёй сэксуальнай арыентацыі і гендарнай ідэнтычнасці – сённяшнія рэаліі жыцця ЛГБТК-супольнасці ў Беларусі..

Нямала прадстаўнікоў ЛГБТК-супольнасці працягвалі ўцёкі з Беларусі ў страху за сваё жыццё і бяспеку на радзіме.

На жаль, некаторым з іх было складана атрымаць міжнародную абарону. Гэтак, балгарскія ўлады адмовілі ў прытулку квір-актывісту з Беларусі. Гэтай асобе пагражае высокая рызыка дэпартацыі ў краіну паходжання.

## 2. АСВЯТЛЕННЕ ЛГБТК+ ТЭМАТЫКІ Ў БЕЛАРУСКІХ МАСМЕДЫЯ

Дзяржаўныя і праўладныя прапагандысты працягвалі прыкладаць намаганні па стыгматызацыі і шальмаванні беларускай ЛГБТК+ супольнасці, распальваючы нянавісць да прадстаўнікоў квір-кам’юніці ў беларускім грамадстве.

Гэтак дзяржаўныя СМІ займаліся распаўсюджваннем ілжывых, канспіралагічных і зневажальных паведамленняў пра прадстаўнікоў ЛГБТК+ супольнасці падчас асвятлення Алімпійскіх гульняў у Парыжы, а таксама падчас рэпартажаў аб прыняцці ў Грузіі закона супраць “ЛГБТ-прапаганды” і будучых прэзідэнцкіх выбарах. выбары ў Малдове.

Беларускія незалежныя СМІ ў разглядаемы перыяд у асноўным падтрымлівалі ЛГБТК+ супольнасць, асвятляючы праблемы, з якімі сутыкаецца квір-кам’юніці ў Беларусі і ў выгнанні, а таксама паказваючы на небяспеку распальвання нянавісці ў адносінах да ЛГБТК-людзей з боку уладаў ды гамафобных СМІ і блогераў, якія падтрымліваюцца дзяржавай.

**Еўрапейскае радыё для Беларусі:**

Куды прыводзіць дзяржаўная ксенафобія – Gender Gap

З Балгарыі могуць дэпартаваць прадстаўніка ЛГБТ з Беларусі

Зачыстка: мінімум восем транс-персон затрыманыя ў Беларусі

**Zerkalo:**

“Пастка для беларуса”: ЛГБТ-актывісту не даюць абарону ў Нямеччыне

Супольнасць трансперсонаў распавяла пра масавыя затрыманні ў Беларусі, вядома пра крымінальныя справы

3. **НАВІНЫ ПРАВААБАРОНЧАЙ ІНІЦЫЯТЫВЫ “ЖУРНАЛІСТЫ ЗА ТАЛЕРАНТНАСЦЬ” (J4t) / Gpress.info**

***J4t Awards 2024***

Праваабарончая ініцыятыва “Журналісты за талерантнасць” абвясціла свой традыцыйны штогадовы конкурс J4t Awards 2024 дзеля таго, каб вызначыць і ўганараваць найбольш сацыяльна адказных журналістаў і медыі. Пераможцы сёлетняга конкурса будуць абвешчаныя напрыканцы снежня 2024 года падчас юбілейнай імпрэзы, прысвечанай 15-годдзю J4t.

***Gpress.info***

Інтэрнэт-сайт Gpress.info / Gaypress.eu працягваў інфармаваць беларускую ЛГБТК+ супольнасць унутры краіны і на выгнанні пра развіццё падзеяў у квір-кам’юніці, надаваў парады пра тое, дзе атрымаць падтрымку і як застацца ў бяспецы, знаходзячыся ў Беларусі, а таксама пра тое, як перабрацца ў бяспечнае месца за мяжой у выпадку патрэбы.

Акрамя гэтага, рэдакцыя сайта працягвала ўзмацняць голас грамадскіх ініцыятываў і паасобных квір-актывістаў, якія паўсталі ў абарону ЛГБТК+ супольнасці Беларусі.

***Gpress.info*** у сацыяльных сетках і мэсэнджэрах:

TikTok

Telegram

Facebook

Instagram

УКантакце

Twitter

YouTube

E-mail: gaypresseu@gmail.com

**© “Journalists for Tolerance” Human Rights Initiative, 2024**

*It is mandatory to refer to the “Journalists for Tolerance” Human Rights Initiative, while quoting E-Newsletter “LGBTQ+ in Belarus”*